**Міхась Болсун**

# *ЯБЛЫНЯ Ў ФАЦЕ*

ВЕРШЫ

**Гомель**
**2004**



## АД АЎТАРА

Лёсам мне было вызначана нарадзіцца 23 лютага 1942 года у вёсцы Балсуны Чачэрскага раёна ў сялянскай сям'і. Дзяцінства прайшло там жа. У свой час скончыў Палескую СШ, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны, аддзяленне журналістыкі Мінскай ВПШ.

Працаваў рабочым саўгаса на Украіне, загадчыкам сельскай бібліятэкі, настаўнікам у вёсцы Палессе. Служыў у Савецкай Арміі.

З 1965 года - на журналісцкай рабоце. Літсупрацоўнік, загадчык аддзела, адказны сакратар, намеснік рэдактара - такі мой шлях у чачэрскай раённай газеце "Трыбуна камунізму". Сем гадоў працаваў галоўным рэдактарам буда-кашалёўскай газеты "Авангард", семнаццаць - старшым рэдактарам і загадчыкам аддзела Гомельскага абласнога тэлерадыёаб'яднання.

Член Саюза журналістаў Беларусі. Зараз жыву ў Гомелі.

Вершы пачаў пісаць яшчэ школьнікам. Друкаваўся ў розных перыядычных выданнях, удзельнічаў у літаратурных перадачах на тэлебачанні і радыё. "Яблыня ў фаце" - мой першы самастойны паэтычны зборнік і прысвячаю яго сваім землякам - жыхарам Чачэршчыны.

## СЛОВЫ НА ДАРОГУ

Яблыня ў фаце... Нават рука не падымаецца браць у двухкоссе назву першага паэтычнага зборніка нашага земляка Міхася Болсуна. Калі ў аўтара захавалася юначае бачанне свету, грэх узгадваць пра ўзрост чалавека, які дорыць нашчадкам такія шчымлівыя пачуцці-радкі:

*Маё пакаленне – падранкі вайны,*
*Хоць шрамаў няма на іх целе.*
*Вярэдзяць душу неспакойныя сны,*
*У памяць мінулага цэляць...*

Вёску Балсуны, дзе нарадзіўся паэт, нават з вышыні Чачэрскай ратушы немагчыма пабачыць. Але яна, як і раней, стаіць на сваім месцы. Басаногая мясцовая малеча і сёння ведае, што суседскія яблыкі значна смачнейшыя, чым у бацькоўскім садзе. І ў гнуткай, як лазіна, рачулцы Каўпіце мянтузы не пераваліся:

*Дзіцячых год маіх калыска,*
*У цяжкі час была кладоўкай:*
*У нератах язь срэбрам бліскаў,*
*І шчупакоў я вудзіў лоўка...*

Сапраўды, на жаль, такая ідылія прыгадваецца нам часцей за ўсё толькі ў снах, ці ўспамінах. А рэчаіснасць больш празаічная: "...ляцяць, нібыта хтосьці гоніць, за небакрай жыцця гады".



Але аўтару гэтых радкоў песімізм не ўласцівы. Так, на яго памяці пасляваенная нішчымніца з яе бульбай-гнілушкамі, кіслым шчаўем, пустой заціркай. Першыя мазалі ад важкага бацькавага касся... Але запала ў душу і іншае. Уцалелых падчас вайны аднавяскоўцаў, як і яго аднагодкаў, падкармлівала сама палеская прырода. Тая ж самая Каўпіта, суседні шчодры на ягады і грыбы лес. Яшчэ нядаўна ён даваў прытулак тутэйшым партызанам, а цяпер дзяліўся сваімі дарамі з дзятвой і дарослымі. Адсюль і аптымізм аўтара ва ўспрыняцці навакольнага свету:

*Калі ж хмурынка набяжыць,*
*Пальецца дожджык спорны,*
*Аднак яму не патушыць*
*Сунічны жар усё роўна.*

Але не толькі ўспамінамі аб пасляваенным жыцці-быцці, басаногім дзяцінстве, перажываннямі першых юначых пачуццяў напоўнена паэзія Міхася Болсуна. Ён – наш сучаснік, які да таго ж будучы па прафесіі журналістам, нямала паездзіў па свеце, пабачыў на свае ўласныя вочы. Не дзіўна, што і шматлікім яго вершам уласціва сапраўды грамадзянскае гучанне: "У шпіталі інвалідаў", "Старэе вёска.Смех дзіцячы...", "Коціцца кола жыцця пад гару..." і г.д.

Родны край паэта - Чачэршчына істотна пацярпела ад чарнобыльскай бяды. Пераадольваць яе вынікі давядзецца яшчэ многім пакаленням. А ў многім, як лічыць паэт, вінаватыя мы самі:

*Усё турботы, турботы –*
*Ад сяла да сяла.*
*Колькі лішняй работы*
*Нам нядбайнасць дала?!*

І яшчэ адна адметная рыса зборніка. Звярніце ўвагу на наступныя радкі:“Выспелі зоры ў нябеснай прасторы...”, “Бор загарэў, як курортнік ля мора...”, “На цымбалах звонкіх капяжоў сакавік чачотку выбівае...”. Хіба гэта не паэзія?..

Такія радкі, як і шматлікія іншыя, лепш за ўсё сведчаць аб вобразным, сапраўды паэтычным светапоглядзе аўтара. Яго вершам не ўласціва рытарычнасць. У душы і творчасці Міхась Болсун перш за ўсё лірык. Менавіта да такой высновы прыходзіш, падсумаваўшы ў памяці прачытанае. І міжволі ловіш сябе на жаданні зноў, яшчэ раз перагартаць многія старонкі, каб пасуперажываць паэту наноў.

Алесь Дуброўскі.



## ЧАЧЭРСКІ КРАЙ

Чачэрскі край - абсцяг пад сонцам,
Радзіма продкаў і мая,
Дзе самародкам льецца слоўца
І знак вякоў нясе зямля.

Чачэрскі край - старонка гэта
Пакрыта славай ваяроў
І працай рупнаю сагрэта,
Дзе ніў размах і шум бароў.

Чачэрскі край бярозак белых,
Блакітных сподкаў азярын,
І рэк, што ў далячынь пабеглі,
І барваў ранішняй зары.

Перад травінкай, краскай кожнай
Гатоў упасці ўдзячна ніц.
Адлётны крык гусей над пожняй
Ва мне тужлівасцю шчыміць.

Чачэрскі край! Тут “мірны” атам
Сарваўся з неба на бяду.
Людзьмі пакінутыя хаты
Ўраслі па вокны ў лебяду.

Ды не скарыўся край няўзгодзе.
Багацце шчырае душы
Жыве стагоддзямі ў народзе,
Як і гасціннасць - без мяжы.

Чачэрскі край з блакітам веснім -
Вясёлы песенны прастор.
Як запяюць жанкі ў Палессі -
Падхопіць іх Залескі хор.

Чачэрскі край! Шапчу бясконца
Прызнанне шчырае: люблю
Ўсіх землякоў, жыццё пад сонцам
І продкаў вечную зямлю.

*15.10.2003г.*



## ГАРАДОК

*Да 845-годдзя Чачэрска*

Дзевяты век маленькай кропкай
Ляжыць на карце гарадок,
Дзе лета пахне густа кропам
І спелай слодыччу садоў;
Дзе стужкай - поясам Чачора
Абвіла замчышча гару,
Вясной разносіць гул маторак,
Купае летнюю зару.
Дзяўчом-гарэзаю прыгожай
Бяжыць, спяшае кожны дзень,
Абняцца хочацца ёй з Сожам
Навідавоку у людзей.
А побач - гораду раздолле,
Лінейкі вуліц праляглі
Аж з Ганнаполля, Захарполля
Да гарадзішча, старых ліп;
Да ратушы, цэнтральнай плошчы,
Вякоў спляліся дзе сляды,-
Вятрыска родны сцяг палошча,
І знакі бачацца бяды.
Магілу брацкую салдатаў
Прыняла мужная зямля,
Іх ахінаюць дрэваў шаты
І едуць родзічы здаля.

Шануюць памяць чачаране
Байцоў, забітых на вайне.
Смыляць у сэрцах яшчэ раны
Ад страт у роднай старане.
...Хаджу па вуліцах райцэнтра
І дзе-нідзе спыняю крок,
Хачу па спадчыне бясцэннай
Вучыць гісторыі урок.

*22.12.2003г.*



## ХЛЕБ

Чорны хлеб - гэта золата
злітак,
Ды і яно яму не раўня.
Успамінаю: барануем жыта,
Падганяю старога каня.
А на полі - адны жанчыны
І чародка маіх сяброў.
Тры гады не аралі мужчыны,
Іх забрала вайна з двароў.
Тут нялёгка. І тут - край
пярэдні,
Не сціхае бой за жыццё.
Падкамкаўшы зрэбны пярэднік,
На мяжы корміць маці дзіцё.
Зашугае ж калоссем жыта,
Як шугае зара сама...
Чорны хлеб - працы цяжкае
злітак,-
Я з маленства цаню яго смак.

## ПАДРАНКІ

Маё пакаленне - падранкі вайны,
Хоць шрамаў няма на іх целе,
Вярэдзяць душу неспакойныя сны,
У памяць мінулага цэляць.

Спяваў калыханку мне Паламскі лес
Пад трэск аўтаматаў у вёсцы.
Жыў страх у вачах учарашніх гарэз,
Слязамі цёк сок па бярозцы.

Нішчымніца мачыхай злоснай была,
На беднай трымала дыеце.
Надзённаю мараю вёска жыла,
Хавала, як скарб, лусту дзецям.

Мужнелі падлеткі за плугам, касой,
На крылы ўздымаліся рана,
Галоўны ўсё-ткі свой выйгралі бой -
Жыццё ацалела падранкаў.



## У ВЫЗВАЛЕНЫМ ГОМЕЛІ

Ляжаў у коме дымны Гомель,
Бы цяжка зранены салдат.
Гудзеў вятроў асенніх гоман
Сярод руін дамоў і хат.

Каміны іх - патухлай свечкай,
Як зла фашыстаў напамін.
І стаў вайне рахунак вечным:
Забіты бацька, муж і сын...

Дзяды, бабулі, з імі дзеці
Салдат страчалі баявых.
Гасцінцам лепшым быў на свеце
Сухарык чэрствы для малых.

І парк стары над кручай Сожа
Глядзеў з надзеяй у ваду:
Адбудаваць мы горад зможам,
Бо ў нас жыве стварэння дух.

...Цяпер на свята Перамогі
Іду да Вечнага агню,
Салдату бронзаваму ў ногі
Без слоў удзячна пакланюсь

*19.08.2003г.*

## ЧАЧЭРСК, ЛІСТАПАД 43-ГА

Баёў грымелі навальніцы.
Свістаў, шыпеў свінцовы дождж.
Ракет мільгалі бліскавіцы
І падалі ў асенні Сож.

Наўкол, бы воспай, луг пабіты -
Варонак, рытвін не злічыць.
Плыты байцы з маўклівым спрытам
На плёсы спіхвалі ўначы.

Рады траншэй і гнёзды дзотаў
Ламаў упарта наш салдат.
У бой ішлі за ротай рота,
Ахрыпла кліч крычаў камбат.

Чачэрск курыўся дымам едкім,
Паўсюдна - ворагаў сляды:
Шкілеты хат - нямыя сведкі, -
І зруйнаваныя сады.

І роў глыбокі ля бярозак -
Магіла брацкая ахвяр -
Запомніў плач яўрэйкі Розы,
Які кляў катаў за кашмар.

І вось свабоды вецер свежы
Загуў шчасліва ў гарадку...
На радасцях спяшаўся снежань
Пракласці мост праз Сож-раку.



## БАЛАДА ПРА ЮНАГА ПАРТЫЗАНА

*Памяці Грышы Падабедава*

Вясновая стаяла ноч.
Драмалі сцішаныя хаты.
Хлапчук не спаў. Не зводзіў воч,
Бы знаў, што сёння прыйдуць каты.
Пачуў гамонку ля варот,
У дзверы грукнулі прыклады.
Шмыгнуў Рыгорка ў агарод,
Там лазня, а далей - прысады.
Зашыўся ціха ў ёй хлапчук
І назіраў за мамай, татам,
Сясцёр малодшых плач пачуў,
Калі выводзілі іх з хаты.
Блукаў па вёсачках Рыгор,
Шукаў дарогу ў лес, да брата...

...Жывіцы пах разносіў бор,
Высокім голлем неба кратаў.
Між дрэў - зямлянкі, будны.
І варта пільная са зброяй
Кароткія вартуе сны
Народных мсціўцаў пасля бою.
Сярод разведчыкаў малы
Быў назіральны не па ўзросту,
Не дзеля славы і хвалы
З жабрацкай торбай мераў вёрсты.

Прасіў жалобна ў немцаў хлеб,
Не забываў пры гэтым Бога,
А сам абмацваў вокам хлеў,
Дзе кулямёт сцярог дарогу.
Гарматы, танкі ў вішняку
Лічыў, адкладваючы ў памяць.
Ён бачыў на малым вяку,
Як злосна вые вайны замець.

...Была патрэба ў муцэ.
Атрад ужо без хлеба снедаў.
У хлопца - лейцы у руцэ,
На млын спяшае Падабедаў.
Мікола-партызан з ім тут,
Трымае аўтамат на ўзводзе,
Глядзіць наўкол, бы на пасту,
Затым на млын каня заводзіць.
Мінуты цягнуцца, як дні,
Хутчэй бы загрузіць падводу,
Ды тут млынар крычыць: "Гані,
Вунь пруцца каты з агароду!"
Хмызняк не змог схаваць дваіх,
Агонь варожы гаўкаў злосна.
Мікола войкнуў і заціх,
Рыгорку бегчы ў пушчу позна.
Трашчаў прыцэльна аўтамат,
Трымаў хлапчына абарону.
Было патронаў жа няшмат,
І стрэл апошні - сабе ў скроню.



Адвазе даўнасці няма,
Яна - любоў, краіне вернасць.
...Калыша параход імя,
Якому плыць і плыць у вечнасць.

*10.11.2003г.*

## У ШПІТАЛІ ІНВАЛІДАЎ ВАЙНЫ

Зліліся тут франты ў фронт адзіны,
Дзе толькі водар лесу, неба сінь.
Гады жыцця адлічвае гадзіннік
На цыферблаце дрогаткіх асін.

А мыліц скрып - як скрып на пераправе,
Наведзенай калісьці пад агнём.
Сівыя ветэраны ратнай справы
Сябруюць і сягоння з мазалём.

У снах шчэ падымаюцца з акопаў,
Пускаюць эшалоны пад адхон,
Сціраюць з твараў зачарнелых копаць,
Крычаць няведама каму:"Агонь!".

І будзе так заўсёды ў іх, да скону,
У памяці - рады палеглых рот...
Трымаюць ветэраны абарону,
Атакі адбіваючы хвароб.



## ПОМНІК

Не змог салдат дайсці да роднай вёскі,
Занадта цяжкім быў дахаты шлях...
Шэпчуцца ля помніка бярозкі,
Вядуць размову аб былых гадах.
А ён стаіць са скаткай за плячыма,
Нібы сабраўся зноўку ў паход.
...Ніколі не забудзе тых Айчына,
Хто жыццё аддаў за свой народ.

*1959г. в.Балсуны*

## НА МАРШЫ

Вядзе па стэпе пыльная дарога,
Пот соллю выступае на плячах.
Гудуць ад стомы ў цяжкіх ботах ногі,
А ўперадзе яшчэ вялікі шлях.

І раптам чуем нечы голас збоку:
-- Гэй, запявала, песню пачынай!
І вось яна ўжо птушкаю высока
Ляціць і падымае небакрай.

І ўсміхнуўся старшына наш строгі,
І аўтамат паправіў кожны свой,
І лёгкаю здалася нам дарога,
Нібыта столькі не ішлі па ёй.

*1964г.*



## ДАРОГА Ў ВЁСКУ

Прачнуўся ранак
Летні над ракой,
Прылёг на беразе
Пагрэцца...
Вядзе дарога
Зноў да землякоў,
Якім вязу пачуцці сэрца.

Мільгаюць сосны
І гурты бяроз,
Багун
І ландышаў суквецці.
А думкі там даўно,
Дзе калісь рос,
Дзе хата бацькі
Сціпла свеціць.

Ля студні бразне
Вёсачка вядром,
Жаўрук праколіць
Паднябессе,
Гасціннасцю сустрэне
Кожны дом:
- Заходзь, сынок,
Тваё ж Палессе.

## УСПОМНЮ ПАЛЕССЕ СВАЁ

*Уладзіміру Ядранцаву*

Істужкай блакітнай Каўпіта
За вёскаю роднай імчыць.
Пад ветрам калышыцца жыта
І бронзай на сонцы блішчыць.
Тут ліпы пахучыя лісцем
Просяць пад засень густы,
Маё тут блукала дзяцінства -
Дзе бесклапотнасць дзён тых?
Праходзяць гады чарадою,
Мінула юнацтва маё.
Сустрэнуся з шчасцем, бядою -
Успомню Палессе сваё,
Дзе вечарам веснім дзяўчаты
Мараць аб любых сваіх,
Гармонік сумуе ля хаты,
Да ранку пяюць салаўі,
Дзе песень ляцяць пагалоскі
З вуліц вячэрніх у гай...
Дзень добры, зарэчная вёска,
У будні і святы прымай!



## ВЫТОК

*Валянціне Курчавай*

Вёска Палессе.
Вось вуліцы рог -
Месца бацькоўскае хаты.
Побач алешнік,
крыніца,
мурог,
Бусел на лузе цыбаты.
Родны да болю,
Мілейшы куток, -
Радасць дзіцячых уцехаў.
Клікаў купацца
Тут Саўкаў вірок,
Бераг звінеў доўга смехам.
Вечарам лодкаю
плыў маладзік,
Песні блукала дзесь рэха.
Часта гудзеў
пад акном грузавік -
Бацька ў чарговы рэйс ехаў.
Гразь у канавах,
завеі зімы
Коламі ГАЗік пракручваў, -
Хлеб зарабляў
для вялікай сям'і
Бацька і муж Міша Курчаў.

Маці ў бальніцу
ранкам ішла -
Медык цудоўны, ад Бога,
Светлай, празрыстай
душы, бы са шкла,
Жаль, яе знікла дарога.
Дочкі з падворка,
бы птушкі з гнязда,
Шляхам сваім паляцелі.
Хутка ў Каўпіце
сплывае вада,
Памяць жа ў кут
родны цэліць.
Едуць сюды
не па смутак яны -
Покліч прыводзіць традыцый.
Тут іх жыццёвы выток,
карані,
І - непаўторнасць крыніцы.

*22.01.2004г.*



* * *

Падзей віхурыць замець -
У сэрцы іх сляды...
Касу кляпае памяць,
Пракос вядзе туды,
Дзе пацеркі, як срэбра,
Рассыпаны ў траве,
Дзе састарэла грэбля,
Але стаіць, жыве.
Вярба там мые косы
Штодзень рачной вадой,
Схіліўшыся над плёсам
Зялёнай галавой.
Там раўнадушша крыгі
Растопіць прыгажосць...
Хоць затрымаўся крыху,
Ды ўсё ж я свой - не госць.
Тугу далей адпрэчу,
Туман вазьму ў сябры.
Пайду ў прастор зарэчны
Глядзець агонь зары.
Душой чысцейшы станеш
Сярод лугоў, палян.
Там сам сабе не зманіш, -
Там родная зямля.

## ЗЕМЛЯКАМ

Добры дзень, землякі!
Поціск вашай рукі
Мне на сэрца
Любоўю кладзецца.
Зноў стаю ля ракі,
Шэпчуць штось лазнякі,
Дзікі хмель
На алешыне ўецца.

Смолкі клейкі лісток,
Сіні-сіні званок -
Ловіць позірк
Знаёмыя краскі.
Льецца песня жанок -
Спеваў лепшы урок,
Нібы матчына
Слова і ласка.

Шмат я зведаў дарог,
Ды вясковы парог
Кліча, цягне,
Нібыта магнітам,
Бо забыць я не змог
Хату, рэчку і лог,
Сцежку росную
Ў Палам* праз жыта.



Добры дзень, землякі!
Поціск вашай рукі
Шчырым словам
Маім адгукнецца.
Дзе шчэ стрэнеш такі
Вачэй цёплы блакіт,
Крылы думак
І чулае сэрца?!

*25.01.2004г.*

---

*Палам - былы пасёлак на Чачэршчыне.

## КАЎПІТА

Рака Каўпіта жылкай сіняй
На целе б'ецца Беларусі.
На берагі прыходжу сынам,
Калі і ў радасці, і ў скрусе.
Дзіцячых год маіх калыска.
У цяжкі час была кладоўкай:
У нератах язь срэбрам бліскаў,
І шчупакоў я вудзіў лоўка.
Яшчэ і сёння голас - рэха
Блукае сярод траў, кустоўя.
І хоць даўно адсюль паехаў,
Ды сніцца пах духмяны стога,
Дзе травы-зёлкі, смолкі-краскі
Вярэдзяць сэрца так няўмольна.
І зноў рака дзівоснай казкай
Заве ў блакітнае прыволле.



## МАЯ РАКА

Я многія бачыў рэкі,
Мая ж рака–не з такіх,
Бо коціць на хвалях рэха
Трывожнае - маці ласіх.

На лузе дзяркач не змаўкае,
Крычыць:
            -Годзе спаць,
            -Годзе спаць.
Туман на ўзбярэжку блукае,
Начлегу не змог адшукаць...

Як неба ўспыхне на ўсходзе
І сонейка ў вір упадзе,
На бераг памыцца прыходзіць
Па травах няскошаных дзень.